УДК 342+33

# КАНСТЫТУЦЫЙНА-ПРАВАВЫЯ ПРЫНЦЫПЫ РЭГУЛЯВАННЯ ЭКАНАМІЧНЫХ АДНОСІН У РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

***І. С. Савінаў*** (Магілёўскі інстытут МУС РБ)
Навук. кір. ***А. С. Майсевіч,***
выкладчык

Эканамічныя адносіны, што складваюцца пры вытворчасці, размеркаванні, абмене і спажыванні матэрыяльных каштоўнасцей, з'яўляюцца цэнтральным элементам эканамічнай сістэмы. І дадзеныя адносіны ў сучаснай дзяржаве павінны асноўвацца выключна на прававых прынцыпах.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Прававое рэгуляванне эканамічных адносін у Рэспубліцы Беларусь засноўваецца на прынцыпах, замацаваных у Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (далей па тэксту – Канстытуцыя) [1].

Менавіта аналіз Асноўнага Закона краіны дазваляе нам прыйсці да высновы аб магчымасці сістэматызацыі канстытуцыйных прынцыпаў рэгулявання эканамічных адносін у Рэспубліцы Беларусь.

Так, нормы Канстытуцыі, што замацоўваюць:

– раўнапраўе і недатыкальнасць усіх формаў уласнасці;
– гарантаванасць роўнай абароны і роўных умоў для развіцця ўласнасці;
– роўнае права на ажыццяўленне гаспадарчай і іншай дзейнасці, акрамя забароненай законам;
– абавязак дзяржавы спрыяць развіццю кааперацыі;
– гарантаванасць роўных магчымасцяў для вольнага выкарыстання здольнасцей і магчымасцей для прадпрымальніцкай і іншай не забароненай эканамічнай дзейнасці;
– рэгуляванне эканамічнай дзейнасці ў інтарэсах чалавека і грамадства;
– накірунак і каардынацыю дзяржаўнай і прыватнай эканамічнай дзейнасці ў сацыяльных мэтах;
– гарантаванасць асноўных працоўных праў грамадзянаў [1] утвараюць сістэму *канстытуцыйных прынцыпаў рэгулявання эканамічных адносін* у Рэспубліцы Беларусь.

Дадзеныя нормы стымулююць лібералізацыю і дэмакратызацыю грамадства, імкнуцца да стварэння такіх эканамічных умоў, якія забяспечаць жыццяздольнасць грамадства і ўсіх яго членаў, будуць з'яўляцца асновай рэгулявання эканамічных адносін у нашай краіне.

**Літаратура**

1. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь : са зм. і дап., прынятымі на рэсп. Рэферэндумах 24 ліст. 1996 г. і 17 кастр. 2004 г. – Мінск: Беларусь, Мін. інф. Рэсп. Беларусь, 2008. – 4,88 выд. арк.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова